Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Дэма-версія практычнага задання для экзамена па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 5. Варыянт 3. Ч.2**

**Білет № 5. Практычнае заданне. Развіццё культуры ў БССР у другой палове 1940-х - 1980-я гг.**

**Заданні склала:**Кліменка Вікторыя Ігараўна, намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце, настаўнік гісторыі і грамадазнаўства ДУА "Сярэдняя школа №7 г.Мазыра",

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні:**

1. Вызначыце, якія ВНУ рэспублікі забяспечвалі неабходнымі кадрамі працэс развіцця навукова-тэхнічнай рэвалюцыі.
2. Якім чынам сфера адукацыі задавальняла патрэбнасці індустрыяльнага развіцця БССР у пасляваенны час?
3. Якімі асаблівасцямі эканамічнага развіцця БССР у 1940-1985 гг. можна растлумачыць павелічэнне колькасці вышэйшых і сярэдніх спецыяльных адукацыйных устаноў, а таксама студэнтаў і вучняў у іх? Канкрэтызуйце свой адказ прыкладамі з крыніц.
4. Зрабіце вывад аб забяспечанасці агульнаадукацыйных школ педагагічнымі кадрамі. Што гэтаму спрыяла?

**Крыніца I**

**З даклада сакратара ЦК КПБ Т.С.Гарбунова «Аб некаторых пытаннях ідэалагічнай працы і задачах партыйнай арганізацыі ўніверсітэта па выхаванні студэнцтва» 17 снежня 1957 г.**

…нельга сказаць, што ў нас няма поспехаў у галіне развіцця навукі, вышэйшай і сярэдняй адукацыі, у галіне развіцця нашай літаратуры, мастацтва выяўленчага і тэатральнага. Факты гавораць аб тым, што ў галіне вышэйшай адукацыі, у галіне падрыхтоўкі кадраў, а таксама ў галіне народнай асветы Беларусі абагнала нават такія перадавыя капіталістычныя краіны, як Швецыю і Англію.

Толькі за апошнія гады ў Беларусі адкрыта пяць новых ВНУ: Брэсцкая і Полацкая педінстытуты, Гомельскі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту, Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут, інстытут механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі ў Мінску. У дзеючых ВНУ уведзены шэраг новых спецыяльнасцей. Цяпер у рэспубліцы працуюць 23 ВНУ, у якіх навучаецца больш за 50 тыс. чал., або на 61 працэнт больш, чым у 1950 годзе.

У 122 сярэдніх спецыяльных навучальных установах навучаецца 60 тыс. чал., або на 44% больш, чым у 1950 г.

Акрамя таго, у парадку планавага пераразмеркавання ў БССР штогод накіроўваюцца спецыялісты па многіх спецыяльнасцях з іншых рэспублік Савецкага Саюза. Іх асабліва шмат працуе на нашых трактарным, аўтамабільным, шарыкападшыпнікавым і іншых заводах.

Па стане на 1 ліпеня 1955 г. у БССР ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі і культурнага будаўніцтва працавала 166,5 тыс. спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй адукацыяй. З 1 студзеня 1941 па ліпень 1955 гг. колькасць спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй у рэспубліцы вырасла ў два разы. За гэты перыяд колькасць інжынераў вырасла ў 1,8 раза, тэхнікаў – у 1,7 раза, спецыялістаў сельскай

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі
гаспадаркі з вышэйшай адукацыяй – у 2,2 раза і з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй – у 2,9 раза. Калі ў перадваенным 1940 г. на адну тысячу працоўных і службоўцаў у рэспубліцы прыходзілася адмыслоўцаў з вышэйшай адукацыяй 25 чал. і з сярэдняй спецыяльнай –54 (усяго 79 чал.), то ў 1955 г. на той жа лік працоўных і службоўцаў прыходзілася 50 адмыслоўцаў з вышэйшай і 70 з сярэдняй адмысловай адукацыяй (усяго 120 чал.). Няўжо гэта не поспехі нашай вышэйшай і сярэдняй адукацыі? Гэта вялікія поспехі.

**Крыніца II**

**Вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы БССР у 1940–1985 гады. (на пачатак навучальнага года)***(Крыніца: Народная гаспадарка Беларускай ССР у 1985г.: Стат. Штогоднік. Мінск, 1986г.)*

У пасляваенныя гады для падрыхтоўкі інжынерна-тэхнічных кадраў, якіх не хапала для народнай гаспадаркі БССР, было адкрыта шмат новых ВНУ. Усяго ў 1950/51 навучальным годзе ў рэспубліцы дзейнічала 29 вышэйшых навучальных устаноў, у якіх займалася на 10 тыс. студэнтаў больш, чым перад вайной. Каб забяспечыць патрэбнасці ў спецыялістах новых галін прамысловасці БССР - радыёфізікі, электронікі, радыётэхнікі, прыём у вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы з 1958 па 1965 г. павялічылася больш чым у 2 разы. Калі ў 1959г. у рэспубліцы на 1000 чалавек насельніцтва мелі вышэйшую і сярэднюю адукацыю 304 чалавекі, то ў 1985 г. – 662.

Па гэтым паказчыку на душу насельніцтва БССР займала адно з першых месцаў сярод савецкіх рэспублік.

**Крыніца III**

**Агульнаадукацыйная школа ў БССР у 1940–1985 гг.: на пачатак навучальнага года**(Крыніца: Народная гаспадарка Беларускай ССР у 1985г.: Стат. Штогоднік. Мінск, 1986г.)

| Навучальны год | 1940/41 | 1960/61 | 1970/71 | 1980/81 | 1985/86 |
|---|---|---|---|---|---|
| Колькасць школ | 12 294 | 13063 | 11246 | 6968 | 6223 |
| Колькасць навучэнцаў, тыс. | 1737,1 | 1382,4 | 1852,4 | 1525,2 | 1468,0 |
| Колькасць настаўнікаў, тыс. | 56,9 | 91,3 | 110,9 | 103,1 | 108,7 |

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Адказ:**
**1.**Гомельскі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту, Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут, інстытут механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі ў Мінску

**2.**Сфера адукацыі задавальняла патрэбнасці індустрыяльнага развіцця БССР.
Доказам гэтага служыць наступная інфармацыя:
1. Рост колькасці ВНУ
2. Колькасць інжынераў за некалькі гадоў вырасла ў 1,8 разы, тэхнікаў - у 1,7 разы.
3. Акрамя таго, прыём у вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы з 1958 па 1965г. павялічыўся больш чым у 2 разы.

**3.**Патрэба ў спецыялістах новых галін прамысловасці БССР - радыёфізікі, электронікі, радыётэхнікі.
Рост колькасці вышэйшых устаноў адукацыі, сярэдніх спецыяльных устаноў адукацыі, у якіх рыхтуюць высокакваліфікаваныя кадры для розных галін эканомікі.
Так, напрыклад, у 40-х гадах колькасць ВНУ была 25, а ўжо ў 80-х - 32. Адпаведна і колькасць людзей, якія атрымліваюць вышэйшую адукацыю ўзрасла. Гэта бачна і па росце ўстаноў сярэдняй адукацыі.
Адпаведна эканоміка развівалася і мела патрэбу ў гэтых спецыялістах.

**4.**Прааналізаваўшы табліцу, а таксама іншыя крыніцы, можна зрабіць наступную выснову:
1. У параўнанні з 1940/41 гг. у 1985/86 колькасць педагагічных кадраў вырасла ў 2 разы.
2. Адкрываліся новыя педагагічныя ВНУ. Напрыклад, у Полацку і Брэсце. Акрамя таго, педагагічны інстытут быў і ў Мазыры.
3. Такім чынам, сістэма адукацыі развівалася ў адпаведнасці з рэаліямі таго часу: павялічвалася колькасць ВНУ тэхнічнай скіраванасці, якія рыхтавалі інжынераў. Павялічылася колькасць і педагагічных інстытутаў.
4. Павялічылася колькасць людзей з вышэйшай і сярэдняй адукацыяй у 2 разы (1959г. у рэспубліцы на 1000 чалавек насельніцтва мелі вышэйшую і сярэднюю адукацыю 304 чалавекі, то ў 1985г. – 662)